
БЫЦЬ ПРЫГОЖАЙ — БЫЦЬ САПРАЎДНАЙ
ЧЫРВОНКА

ДЭБЮТ ЯК МАГЧЫМАСЦЬ ДЛЯ ІНШЫХ
ЧЫРВОНКА


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ВЕРАСНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 183 (30063)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«У Акадэміі навук моладзі дадзены ўсе магчымасці: праводзяцца навуковыя канферэнцыі, Фестываль навукі, конкурсы, у тым ліку «Сто маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», таксама назначаюцца прэміі. Мы стараемся падтрымаць маладых вучоных, дапамагчы ім, садзейнічаць іх развіццю, паколькі за імі будучыня. А іх задача — актыўна, напружана і мэтанакіравана працаваць, абараняць кандыдацкія, доктарскія дысертацыі».*

# СПЕЛЫ ЯБЛЫЧНЫ ВЕРАСЕНЬ



Фота БелТА.

У фермерскай гаспадарцы «Спартан-Агра», што ў Маладзечанскім раёне, у разгары збор і закладка на захоўванне розных сартоў яблыкаў. Кіраўнік гаспадаркі Ігар АБРАМЧЫК сёлетнім ураджаем задаволены.

## КОРАТКА

- **Больш за 7,5 млн тон збожжа з улікам рапсу намалочана ў Беларусі.**
- Міжнародная выстава «Дрэваапрацоўка» пройдзе ў Мінску 26—29 верасня.
- **На тэрыторыі Гродзенскай, Мінскай, Брэсцкай і Віцебскай абласцей праводзіцца імунізацыя дзікіх жывёл для прафілактыкі шаленства.**
- Хрэсны ход з копіяй адной з самых шанаваных праваслаўных святынь прыбудзе ў Беларусь 4 кастрычніка.
- **Экспарт беларускіх медпаслуг для грамадзян Польшчы за вясну-лета вырас больш як на 25 працэнтаў.**
- У Віцебскай абласной бальніцы адкрылі траўматолага-артапедычнае аддзяленне.
- **Да 75 працэнтаў гародніны, бульбы, садавіны і ягад у Беларусі вырошчваецца на прысядзібных участках насельніцтва.**

Жыллё

## Кватэры разыходзяцца як гарачыя піражкі

**Як адзначаюць фінансавыя эксперты, рынак жылой нерухомасці выйшаў на беспрэцэдэнтна высокія паказчыкі па колькасці здзелак. Пакупнікі пакуль не збіраюцца спыняцца. А гэта азначае, што 2023 год можа стаць сапраўды рэкордным.**

### Рэкордныя паказчыкі

Летась колькасць здзелак з кватэрамі дасягнула рэкордных значэнняў. Усяго па краіне купілі звыш 55,6 тысячы жылых аб'ектаў, а ў сталіцы — каля 18 тысяч кватэр. За восем месяцаў бягучага года праведзена ўжо больш за 36 тысяч здзелак па краіне і 12,3 тыс. — у Мінску. Многа гэта ці мала? Давайце прааналізуем.



СТАР. 13

На слыху

## СЕЗОН ГРЫПУ ЧАКАЕЦЦА Ў СТУДЗЕНІ — САКАВІКУ

### Эпідэміёлаг расказаў, як і калі лепш прышчапіцца

**З пачаткам навучальнага года рэгіструецца і рост захваральнасці на рэспіраторныя інфекцыі. А іх істотны ўздым у сёлетнім эпідсезоне чакаецца зімой — са студзеня да сакавіка з пікам у лютым. Каб засцерагчы сябе ад адной з самых небяспечных рэспіраторных інфекцый — грыпу, медыкі раяць зрабіць прышчэпку. Якімі вакцынамі сёлета будуць прышчапляць, ці актуальная дагэтуль прышчэпка ад COVID-19 і каму найперш трэба абараніць сябе, расказаў загадчык аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кірыл ІГНАТАЎ.**

### Захваральнасць прышчэпленых у 6,7 раза меншая

Спецыяліст адзначыў: штогод у нашай краіне больш за чатыры мільёны чалавек хварэе на ВРІ, у тым ліку на грып і COVID-19. У цэлым на долю рэспіраторных інфекцый прыходзіцца больш як 98 % ад усёй інфекцыйнай захваральнасці. Дзеці складаюць больш за палову тых, хто хварэе на рэспіраторныя інфекцыі. Пры гэтым апошнія дзевяць сезонаў ахоп насельніцтва прышчэпкамі супраць грыпу складае больш за 40 %. І аналіз у мінулым эпідсезоне паказаў, што больш за 90 % тых, хто захварэў і мае лабараторна пацверджаны дыягназ «грып», не быў вакцынаваны. Захваральнасць прышчэпленых у 6,7 раза меншая, чым непрышчэпленых.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X
23183
9 771990 763008

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!
Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!